Источник: "Рэспубліка" - 2015-07-09

З НАГОДЫ

# СОНЕЧНЫ ЎДАР УРАДЖАЮ



**Амаль 19 тысяч гектараў сельскагаспадарчых культур у Мінскай вобласці пашкоджана ў выніку засухі. Больш за ўсё пацярпелі пасяўныя плошчы ў Старадарожскім, Любанскім, Салігорскім і Маладзечанскім раёнах.**

Уборку пашкоджаных пасеваў на сянаж ужо пачалі. Дарэчы, усяго ў гэтым сезоне ў Мінскай вобласці пасяўная плошча збожжавых і зернебабовых складае 589 тысяч гектараў.

Сіноптыкі прагназуюць, што гарачыня ў краіне пойдзе на спад. Людміла Парашчук, галоўны сіноптык Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя, паведамляе: «Атмасферныя франты ў другой палове тыдня выцісНуць гарачае паветра трапічнага паходжання за межы краіны, таму да нас пачнуць паступаць халаднаватыя паветраныя масы са Скандынавіі, і тэмпературны фон пачне зніжацца».

Паступовае зніжэнне тэмпературы паветра пачнецца ўжо сёння. На большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы, уначы і раніцай у паўднёва-ўсходніх раёнах месцамі моцныя, паведамляюць сіноптыкі. Удзень па захадзе вецер узмацніцца да 15—18 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе 15—22 градусы, удзень — 20—27 градусаў.

Заўтра прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, а ў некаторых раёнах нават прагрымяць навальніцы.

Дождж чакаецца ў выхадныя дні. У суботу ўдзень будзе 16—23 вышэй за нуль, у нядзелю слупок тэрмометра ўстановіцца на адзнацы 17—24 градусы. Толькі па паўднёвым захадзе краіны чакаецца да 26 градусаў цяпла.

**Юлія ПАПКО**
ypopko@bk.ru

## ДАРЭЧЫ

З-за гарачага надвор'я ўраджайнасць азімых збожжавых будзе ніжэйшая на 15—45 працэнтаў у залежнасці ад рэгіёна. Канстанцін Шашко, вядучы навуковы супрацоўнік Навукова-практычнага цэнтра па земляробстве НАН, прагназуе: «У Гродзенскай і Віцебскай абласцях зніжэнне ўраджайнасці чакаецца ў межах 15 працэнтаў да ўзроўню мінулага года. Крыху горшая сітуацыя ў Мінскай, Магілёўскай і Брэсцкай абласцях, дзе зніжэнне яе можа скласці 18—20 працэнтаў. А ў Гомельскай вобласці ўраджайнасць прагназуецца на 40—45 працэнтаў ніжэйшая за мінулагоднюю». Вучоны адзначае, што ва ўсім вінаваты дэфіцыт вільгаці ў глебе, выкліканы недастатковай колькасцю дажджоў.

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк» объявляет о проведении переговоров по выбору организации на выполнение работ по обследованию подвальных помещений, сетей водоснабжения и водоотведения здания филиала № 529 по пр-ту Независимости, 56.

**Срок подачи предложений - в течение 10 дней с даты публикации объявления. Всю необходимую информацию об условиях переговоров можно получить по тел. (8-017) 309-10-65.**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

Юлія Папко. Сонечны ўдар ураджаю